*ПАДЗЕЯ*

# ПАД БЕЛЫМ ВЕТРАЗЕМ З «БЕРАГОЎ ДРУЖБЫ»

Шаноўныя сябры! Добрая навіна прыйшла ў Гродна з Растоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі, дзе зусім нядаўна завяршылася фінальная частка V Міжнанарднага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычных перакладаў «Берега дружбы», абвешчаны афіцыйныя вынікі конкурсанай праграмы буйнога творчага форуму. Сярод лаўрэатаў – настаўніца беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 40 г. Гродна, маладая гродзенская паэтэса, перакладчык Аліна Паўлоўская.

Нягледзячы на тое, што галоўная ўзнагарода фестывалю накіроўваецца ў іншы беларускі горад – Гомель, пераклады паэзіі, выкананыя Алінай, многімі членамі журы прызнаныя лепшымі. Нагадаем, што ў бягучым годзе з-за не зусім яшчэ спрыяльнай эпідэмічнай сітуацыі фестываль праходзіць у анлайн-фармаце. Дарэчы, на мінулым фестывалі, які Аліна Паўлоўская наведала ў 2019 годзе, беларуская канкурсантка з горада над Нёманам атрымала абсалютную перамогу.

У творчай праграме сёлетняга фестывалю прынялі ўдзел прадстаўнікі розных рэгіёнаў Беларусі, Украіны і Расіі; «настаўнікі» і «вучні». Больш падрабязную інфармацыю пра фестываль можна даведацца з іншых крыніц, у тым ліку і непасрэдна ад арганізатараў. У сетцы Інтэрнэт з'яўляюцца публікацыі фестывальных відэа-выступаў літаратараў з Гродзенскай вобласці. Міжнародны фестываль «Берега дружбы» стаў яркай і важнай падзеяй нашага літаратурнага і грамадскага жыцця. Мы ў чарговы раз пераконваемся ў тым, што творчая грамадская думка, мастацкае слова служаць надзвычай эфектыўнымі сродкамі ўмацавання дружбы паміж народамі. Менавіта гэты сімвалічны сэнс закладзены ў назву фестывалю. І ні адлегласці, ні дзяржаўныя межы паміж намі не могуць перашкодзіць яднанню людзей, іх узаемнаму духоўнаму ўзбагачэнню, развіццю гарманічнага і змястоўнага дыялогу нашых культур.

Яшчэ па тэме, калі ласка, сачыце за абнаўленнямі нашага сайта і матэрыяламі ў сацыяльных сетках.



А сёння ад імя ўсёй Гродзеншчыны літаратурнай мы сардэчна віншуем нашу зямлячку, таленавітую паэтэсу, перакладчыка Аліну Паўлоўскую з чарговай перамогай. Па традыцыі шчыра жадаем лаўрэатцы-зямлячцы моцнага здароўя, невычэрпнага натхнення і, вядома, новых здзяйсненняў ды перамог на літаратурнай ніве. Брава, Аліна!

**ГрАА СПБ**
Жнівень 2020

